УДК 821.161.3-4

***А. У. Сузько***

# СПЕЦЫФІКА ЭСЭІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ВОБРАЗА ПАЭТАЎ Ў КНІЗЕ В. КУЛЯШОВАЙ “ЛЯСНОМУ РЭХУ ПРАЎДУ РАСКАЖУ…”

*Артыкул прысвечаны аналізу спецыфікі мастацкага ўвасаблення і навуковай трактоўкі жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова ў літаратуразнаўчым эсэ яго дачкі Валянціны Куляшовай “Ляснóму рэху праўду раскажу…”.*

Аркадзь Куляшоў – адна з самых яркіх, неардынарных асоб у беларускім прыгожым пісьменстве. Адказнае стаўленне да паэтычнай творчасці, выключная патрабавальнасць да сябе як да мастака далі падставу многім яго сучаснікам, калегам па пяру называць яго “сумленнем беларускай літаратуры”. Думка пра значнасць асобы творцы, маральную і эстэтычную вышыню яго мастацкай спадчыны лейтматывам праходзіць праз эсэ яго дачкі, журналіста, літаратуразнаўцы Валянціны Куляшовай “Лясному рэху праўду раскажу…”. Невыпадкова яна адзначала: “Усведамленне, што жыву побач з вялікім паэтам, было ў мяне заўсёды. Таму я лічыла сваім абавязкам… захаваць яго чалавечы воблік для патомкаў” [1, 93].

Абраная В. Куляшовай форма літаратуразнаўчага эсэ дазволіла ёй у адвольным, не абмежаваным ніякімі жанравымі рамкамі стылі (на мяжы навуковага даследавання і мастацкага аповеду), расказаць пра бацьку, а дакладней беларускага паэта Аркадзя Куляшова, паказаць яго як роднага чалавека, грамадзяніна, творцу з вялікай літары. Г. Дубіна мяркуе: “У цэнтры твора – творчая асоба, інтэрпрэтацыя якой не можа быць пададзена адназначна, таму эсэ асабліва прыдатнае для рэалізацыі аўтарскай задумы” [2].

Сапраўды, асоба і дзейнасць класіка нацыянальнай літаратуры трактуюцца В. Куляшовай як у рэчышчы навуковага, прафесійнага даследавання, так і ў адпаведнасці з законамі мастацкай вобразатворчасці. Вобраз Аркадзя Куляшова, нягледзячы на акцэнтацыю ўвагі чытача на індывідуальных, тыпова куляшоўскіх характарыстыках і ўласцівасцях, набывае сілу мастацкага абагульнення, за якім прачытваецца жыццёвы і творчы лёс многіх таленавітых паэтаў – яго сучаснікаў.

Нездарма даследчыца звяртаецца да грунтоўных і значных вывадаў пра лёс майстра ў грамадстве славутага рускага кінарэжысёра Андрэя Таркоўскага, які сцвярджаў наступнае: “Сапраўдны мастак, а больш таго – геній, з’яўляецца нявольнікам свайго даравання. Ён лічыць сябе абавязаным служыць сваім дарам людзям як абранец лёсу, абавязак якога – жывіць людзей духоўна” [1, 310]. І ў тым жа раздзеле пад назвай “Планета Куляшова”, што адлюстроўвае маштабнасць і агульначалавечую значнасць

МГПУ им. И.П.Шамякина

яго творчых набыткаў, аўтар эсэ апелюе да выказвання Рыгора Барадуліна, які падкрэсліў, што ў пісьменніцкіх колах яе бацьку называлі “самаахвярнікам”. Грунтуючыся на высновах знакамітых мастакоў, яна адзначае: “Ён (Аркадзь Куляшоў – А.С.) аднадумца ўсіх вялікі нявольнікаў таленту” [1, 309]. Думка гэтая мае пад сабой трывалую аснову ў выглядзе асабістага вопыту зносін, роднасных узаемадачыненняў з беларускім Паэтам.

Матыў заняволенасці сэрца і душы мастака творчай справай і шчырым усведамленнем значнасці свайго паэтычнага прызвання стаў скразным і ключавым у літаратуразнаўчым эсэ “Лясному рэху праўду раскажу…”.

Даследчыца ў згаданай кнізе спрабуе абстрагавацца ад кроўных сувязяў, ад зразумелага суб’ектывізму ў стварэнні вобраза Аркадзя Куляшова, усведамляючы яго выключны талент і ступень адказнасці перад нашчадкамі за аб’ектыўную яго эсэістычную рэканструкцыю.

У традыцыйным літаратуразнаўстве і практыцы школьнага выкладання літаратуры складваецца тэндэнцыя да адназначнай трактоўкі асобы беларускага паэта, пазначанай схематызмам і апісальнасцю. Валянціна Куляшова імкнецца пазбегнуць тэндэнцыйнасці ў стварэнні вобраза бацькі, творачы жывое, непаўторнае яго аблічча, з усімі яго чалавечымі недахопамі, незразумелымі для звычайнага чалавека і звыклымі для мастака дзівацтвамі, аб’ектыўна, як вопытны і дасведчаны літаратуразнаўца, прааналізаваць яго паэтычныя набыткі.

Так, Л. Цімошык мяркуе, што кніга В. Куляшовай – гэта “спроба паглядзець на класікаў як на людзей, якія ў свеце стасуюцца з іншымі, кахаюць, сябруюць, перажываюць, дзеляцца з некім пачуццямі, эмоцыямі, часцінкай душы” [3, 3].

Ужо ў першым раздзеле пад арыгінальнай і празмерна побытава-будзённай для літаратуразнаўчага даследавання назвай “Пажар” яна, зыходзячы са свайго багатага вопыту дачкі паэта, блізкага яму чалавека, тлумачыць псіхалагічныя прычыны маўклівасці бацькі, яго нежадання раскрываць свае душэўныя перажыванні перад роднымі, а тым больш чужымі людзьмі. В. Куляшова апавядае: “…Чатырохгадовага Аркадзя і яго сямігадовага сябра пакрыўдзіў сусед-гаспадар, і дзеці вырашылі адпомсціць… Кінулі ў салому запаленую сярнічку. Усчаўся пажар. Дзень быў ветраны, і палова вёскі згарэла. Раз’юшаны натоўп прагнуў пакарання вінаватых, і бацька сямігадовага хлопчыка на вачах усіх так збіў сына, што той праз тры дні памёр. Хацелі пакараць і Аркадзя, але маці не аддала яго на расправу…” [1, 5].

Падобная падрабязнасць, псіхалагічная дэталь з далёкага дзяцінства пісьменніка, згаданая ў эсэ, садзейнічае стварэнню вобраза дарослага чалавека з дзіцячай, ранімай душой. Горкі вопыт дзяцінства, адчуванне сваёй віны і разуменне непапраўнасці таго, што здарылася, на ўсё жыццё

МГПУ им. И.П.Шамякина

пакінулі глыбокі след у душы паэта, кіравалі яго эмацыянальна-пачуццёвай сферай, зрабіўшы асцярожным і далікатным у выяўленні сваіх пачуццяў, клапатлівым і добразычлівым як у дачыненні да сваіх уласных дзяцей і ўнукаў, так і да ўсяго жывога. Згадаем, што нават гэты аповед родныя Куляшова пачулі тады, калі ён сур'ёзна ўстрывожыўся за ўнучку, якая, схапіўшы запалкі, пабегла з хаты. Такім чынам, праз мастацкае ўзнаўленне дзіцячых успамінаў паэта, праз яркія і страшныя вобразы маленства В. Куляшовай перадаецца складанасць і супярэчлівасць яго душэўнага складу, дзе за знешняй спакойнасцю, стрыманасцю хаваліся сапраўдныя выбуховыя эмацыянальныя буры і катастрофы.

Разуменне каштоўнасці жыцця, дзіцячая непасрэднасць, на думку даследчыцы, кіравалі паэтам і ў адносінах з "братамі нашымі меншымі". Гарманічнае суіснаванне паэта з прыродай, разуменне яе падкрэслены пры апісанні аўтарам эсэ даверлівых і шчырых узаемадачыненняў Аркадзя Куляшова з хатнімі жывёламі. Згадвае яна і вавёрку, што "кусала ўсіх, хто спрабаваў дакрануцца да яе, прызнала ўрэшце толькі бацьку", і пеўніка Піфа, які ўзлятаў "на плячо да бацькі і ўладкоўваўся альбо там, альбо на галаве гаспадара", і кошку Караліну, што, "прыносячы ў дом здабычу, перш чым з'есці яе, лічыла сваім абавязкам пахваліцца ёю бацьку, і таму ён неаднойчы знаходзіў прыдушаных птушак і мышэй у сябе пад ложкам, а аднойчы… мышка ляжала на яго падушцы" [1, 140–142]. Як вядома, свойскія жывёлы давяраюць толькі людзям з чыстай, далікатнай душой; яны тонка адчуваюць біяполе кожнага чалавека. Відавочна, што праз падобныя, амаль казачныя, як з твораў для дзяцей, эпізоды В. Куляшова падкрэслівае добразычлівасць і душэўную цеплыню бацькі.

Падобныя мастацкія інсталяцыі ў эсэ падпарадкаваны задачы "ажыўлення" постаці творцы, актуалізацыі дзіцячай непасрэднасці, крэатыўных, неабыякавых адносін да жыцця ва ўсіх яго праявах як сутнасных атрыбутаў сапраўднага мастацкага таленту.

Дзіцячая непасрэднасць, адсутнасць страху быць смешным і незразумелым у вачах блізкіх і сяброў, уласцівая дзецям, і сур'ёзнае, адказнае стаўленне да паэтычнай дзейнасці спалучаліся, паводле В. Куляшовай, у асобе паэта. Так, адзін з самых прадуктыўных творчых станаў А. Куляшова на першы погляд выглядае недарэчным: "… Цяпер ён будзе ляжаць на сваёй канапе і гадзіну, і дзве, думаючы пра нешта, і турбаваць яго нельга.." [1, 4]. Гэта быў стан найвышэйшай канцэнтрацыі творчых памкненняў паэта, карпатлівай работы яго сэрца, душы і розуму, вынікам якой сталі высокамастацкія творы з глабальнымі агульначалавечымі высновамі аб сэнсе жыцця, творчасці. Стаўленне Аркадзя Куляшова да паэзіі як да справы жыцця неаднойчы падкрэслена ў эсэ "Лясному рэху праўду раскажу…".

Сваімі паводзінамі і стылем жыцця пісьменнік аспрэчваў і традыцыйнае ўяўленне аб пісьменніцкай працы, звязанае з пастаянным

МГПУ им. И.П.Шамякина

карпеннем за рабочым сталом. Для яго паэтычная дзейнасць – плённая работа думкі, узважанай і грунтоўнай. Згадаем амаль анекдатычны выпадак, згаданы В. Куляшовай, аб тым, як пісьменнікам, што адпачывалі ў Доме творчасці “Каралішчавічы”, быў зроблены “сацыяльны заказ”: “Штодня пасля снядання ўсе спраўна займалі месца за пісьмовым сталом і працавалі… Нетыпова паводзіў сябе толькі мой бацька: ён альбо бадзяўся па лесе ў пошуках грыбоў, альбо гуляў у шахматы…, альбо драмаў на канапе… Калі надышоў час справаздачы, высветлілася, што пераможцам стаў Куляшоў, які выканаў заданне за апошнія некалькі дзён тэрміну” [1, 188].

Як бачым, незалежна ад знешняга “гультаявання” думка Паэта працавала пастаянна і няспынна, што падкрэслівае выключнасць яго мастацкага таленту. Такім чынам, В. Куляшова спрабуе паглыбіцца ў творчую лабараторыю пісьменніка, спасцігнуць таямніцы паэтычнай майстэрні Аркадзя Куляшова, адзначыць яго ўнікальны мастацка-эстэтычны вопыт у гісторыі беларускай культуры і літаратуры.

Разам з тым, дачка слыннага творцы адзначае і пэўныя цяжкасці, якія ўзнікалі перад ёй як перад даследчыцай, паколькі сам працэс нараджэння мастацкага твора ўяўляўся паэту далікатнай, інтымнай справай, якая не церпіць чужога ўмяшання. Яна адзначае: “Рукапісы бацька звычайна знішчаў… Неаднойчы мы ваявалі з ім з-за гэтага, але бацька быў няўмольны. І чым больш я даводзіла, што рукапіс дае магчымасць зазірнуць у творчую лабараторыю паэта, тым больш упартым ён рабіўся.

– Не хапала толькі, каб потым у іх капаліся розныя там літаратуразнаўцы! – гаварыў ён з абурэннем.

Нарэшце я зразумела, што якраз ад гэтага пранікнення ў святая святых яго душы ён і бараніўся. Ішло гэта, відаць, ад прагі дасканаласці ва ўсім, а тым больш у галоўнай справе жыцця – у паэзіі. Таму тое, што праходзіла этап эксперыменту, пошуку, было для яго тым запаветным кутком, куды ён не хацеў пускаць нікога” [1, 78].

Ужо ў гэтай выснове адчуваецца грунтоўнасць навуковага погляду аўтара эсэ на праблему псіхалогіі мастацкай творчасці, жаданне надаць эсэ як адвольнай форме выкладання жыццёвага матэрыялу эстэтычную і літаратуразнаўчую канцэптуальнасць.

З эсэ “Лясному рэху праўду раскажу” мы даведваемся і аб тым, што паэт імкнуўся стварыць вакол сябе атмасферу, спрыяльную для творчасці. Сябраваў толькі з тымі, да каго меў сардэчную прыхільнасць. Таму кола яго сяброў было даволі вузкім: А. Твардоўскі, К. Кулієў, Д. Кугульцінаў, М. Дудзін, П. Панчанка, А. Малышка і інш. В. Куляшова мяркуе, што “так ствараў ён для сябе эмацыянальна дадатны клімат – неабходную ўмову паспяховай творчасці” [1, 85]. Невыпадкова згадваецца ў кнізе і выпадак, калі ў санаторыі “Нясвіж” узнікла сярод пісьменнікаў размова пра маскоўскія літаратурныя навіны: “Гутарка адхілілася ў бок ад літаратуры.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Пачаліся расказы пра кур'ёзныя выпадкі, што здараліся з кім-небудзь з пісьменнікаў. Мы весела смяяліся, пакуль я выпадкова не зірнула на бацьку. Зірнула… і збянтэжылася. Ён сядзеў пахмурны, з выразам пакуты на твары…" [1, 75]. Тут адчуваецца жаданне пісьменніка зберагчы паэтычны талент ад жыццёвага бруду, надаць працэсу творчасці і агульнай літаратурнай атмасферы належную вышыню духу, духоўную сакральнасць.

Ствараючы вобраз майстра, апантанага паэтычнай творчасцю, абвясціўшага сябе яе нявольнікам, В. Куляшова не абыходзіць сваёй увагай і драматычных момантаў у яго лёсе. Так, яна адзначае, што, сватаючыся да будучай жонкі, Аркадзь Куляшоў папярэдзіў яе аб тым, што "ніколі і нішто – ні каханне, ні сям'я, ні дзеці – не будуць для яго больш важным, чым яго праца, і што ні дзеля чаго жыццёвага ён не пойдзе на кампраміс з паэзіяй.." [1, 127]. Акцэнтацыя даследчыцкай увагі на падобным выказванні А. Куляшова аб свядомым ахвяраванні інтымным, асабістым жыццём дзеля мастацкай дзейнасці падкрэслівае яе вызначальную значнасць для сапраўднага творцы і надае вобразу Паэта рамантычна-хрысціянскія сімвалічныя характарыстыкі.

Узнікае думка пра выключную мудрасць і далікатнасць жанчыны, што пагадзілася з улікам пастаўленых перад ёй умоў стаць жонкай Паэта.

Але, нягледзячы на драматызм узаемадачыненняў з жонкай, сям'ёй, як і ў кожнага творцы-самаахвярніка, ёсць у паэтычным свеце А. Куляшова тэма кахання-ідэі, першага кахання. Дзіцячая закаханасць Аркадзя Куляшова ў Алесю Карыткіну была неабходна паэту як своеасаблівая духоўная каштоўнасць, стымул для самаўдасканалення, самаразвіцця. Нездарма, асэнсоўваючы жыццёвы лёс бацькі, даследчыца разважае: "Такая ўжо, пэўна, уласцівасць першага кахання – перараджацца ў ідэю кахання, рабіцца чымсьці накшталт яго эталона, высока дзейснага ў сферы паэзіі, бо менавіта ў гэтым на ўсё жыццё нязменным пачуцці шукае паэт душэўнага апірышча ў цяжкія хвіліны жыцця" [1, 112]; "пачуццё такой сілы тлумачыцца, відаць, здольнасцю… абвострана ўспрымаць прыгожае ў жыцці і мастацтве" [1, 113].

Такім чынам, даследчыца падкрэслівае адну з вызначальных рыс у аблічы сапраўднага паэта – яго вернасць свайму прызванню, каханню, сябрам, жыццёвым прынцыпам. Праявай вернасці з'яўляецца і спроба паэта па-філасофску грунтоўна і доказна, у ёмістай мастацкай форме трактаваць жыццёвы і творчы лёс сваіх сяброў: Юлія Таўбіна, Змітрака Астапенкі, Аляксандра Твардоўскага і інш.

В. Куляшова аргументавана тлумачыць прычыны з'яўлення ў творчай спадчыне бацькі матыву пакаяння, жанравых прыкмет рэквіема.

Затоены боль па блізкіх людзях, страчаных у эпоху рэпрэсій і ваеннага ліхалецця, мірнага, але не менш драматычнага, часу, праз пэўны час, пасля глыбокага душэўнага пераасэнсавання і мастацкага



МГПУ им. И.П.Шамякина

абагульнення, выльецца ў велічныя творы накшталт “Маналога”, “Варшаўскага шляху”, у якіх, нягледзячы на прысвячэнні канкрэтным постацям сусветнай паэзіі, праявіцца глыбокі роздум мастака над лёсам вялікага Паэта ва ўмовах уласнай несвабоды, залежнасці ад паэтычнай творчасці.

Відавочна, уласны мастацкі вопыт, пастаянны роздум пра сэнс і змест мастацкай творчасці, уважлівыя назіранні за лёсам творчых людзей абумовілі грунтоўнасць мастацкіх высноў паэта.

Кніга В. Куляшовай – гэта не толькі мастацкая рэканструкцыя вобраза Паэта, але і навуковае прачытанне яго творчай спадчыны. Прычым, яна спрабуе пайсці сваім, арыгінальным даследчыцкім шляхам, пазбягаючы залежнасці ад літаратуразнаўчых аўтарытэтаў.

Асаблівая ўвага надаецца ў эсэ аналізу паэмы А. Куляшова “Сцяг брыгады”, па сутнасці напісанай сэрцам паэта, яго глыбокім болем за невядомы лёс сям’і і народа ў цэлым. Адчуваецца разуменне, з аднаго боку, даследчыцай, і, з другога – дачкой асабістай прыналежнасці да эмацыянальна-духоўнага і вобразнага рэгістра твора. Усведамленне таго, што перажыванні Аркадзя Куляшова за сям’ю, якую ён згубіў на доўгі час на ваенных дарогах, таксама ўвасобіліся ў мастацкай тканіне паэмы “Сцяг брыгады”, надае яе навуковым высновам пераканальнасць. Разам з тым, адчуваецца прафесійнасць літаратуразнаўчых аргументаў даследчыцы: “…Яна (паэма – А.С.) не толькі ламала традыцыі вершаскладання, якія ўжо ўстаяліся ў беларускай літаратуры, але ўзрывала і каноны пабудовы сюжэта, уводзячы ў паэзію будзённыя дні вайны з іх нетыповымі, невядомымі мірнаму часу трагедыямі…” [1, 27]. Заўважаем, што, у адрозненне ад слынных даследчыкаў творчасці Аркадзя Куляшова Р. Бярозкіна, В. Бечыка і іншых, яна звяртае ўвагу на ўнікальнасць жыццёвага матэрыялу, пакладзенага ў аснову твора, у прыватнасці на трагічнае становішча мірнага насельніцтва на акупіраваных тэрыторыях.

Аб’ектывізацыі навуковага досведу В. Куляшовай садзейнічае таксама дэтэрмінаваны законамі жанру эсэ, але часам і нечаканы пераход ад асабіста-інтымнага наймення “бацька” да адцягнена-абстрактнага “Куляшоў”. Часам падобную метамарфозу ў даследчыцкім стылі дыктуюць маштабнасць і глабальнасць узнятых у творах Куляшова праблем. Падобная сітуацыя назіраецца, калі В. Куляшова трактуе прычыны ўзнікнення касмічнай тэмы ў творчасці бацькі, яе мастацкую эвалюцыю. Так, яна мяркуе: “На новай ступені асэнсавання касмічнай тэмы для Куляшова характэрна абвостранае хваляванне за лёс Зямлі і чалавецтва. …Яго стылёвая манера вызначаецца глыбокім драматызмам, выключнай цеплынёй і лірычнасцю” [1, 89].

Клопат пра лёс чалавецтва, пра яго духоўны дабрабыт, на думку даследчыцы, кіраваў паэтам і ў сацыяльна-значнай, не звязанай з творчасцю, дзейнасці: “Грамадская кар’ера не патрабавала ад бацькі нічога



МГПУ им. И.П.Шамякина

такога, што было б недасягальным для яго, але сваім вышэйшым грамадзянскім абавязкам Куляшоў лічыў працу пры пісьмовым стале. Ён, які так рашуча адкідаў усё, што перашкаджала гэтай працы, не адмовіўся толькі ад пасады старшыні Беларускага камітэта абароны міру” [1, 70].

Усведамленне адказнасці за лёс чалавецтва спалучаецца ў паэзіі А. Куляшова з пастаяннай прагай самаўдасканалення, настойлівай працай над эстэтычнай вытанчанасцю і мастацкай змястоўнасцю паэтычнага радка. Так, В. Куляшова, апелюючы да перакладчыка твораў паэта на рускую мову Якава Хелемскага, піша: “Бацька правіў свае вершы ўвесь час, пакуль была хоць якая-небудзь магчымасць уносіць праўкі ў нават ужо набраны друкарняй тэкст…” [1, 179]. Падобную з’яву яна тлумачыць атаясамліваннем паэзіі і жыцця яе бацькам, яго вучобай у геніяльных майстроў слова – Лермантава, Пушкіна, Шаўчэнкі і Купалы, – што, паводле яе разваг, і акрэсліла яго творчы ўзровень.

Лёс паэта ў грамадстве, захопленым матэрыяльнымі праблемамі, драматычны і нагадвае гісторыю жыцця і прыгод “рыцара сумнага вобраза” Дон Кіхота, чые ўчынкі ўяўляюцца несур’ёзнымі, але і прымушаюць задумацца над значнасцю абсалютных каштоўнасцяў, такіх, як свабода, творчасць, каханне, сяброўства і г. д. Відаць, таму В. Куляшова аднаму з раздзелаў свайго літаратуразнаўчага эсэ дала сімвалічную назву – “О, Дон Кіхоты!” Толькі той, хто атрымаў каралеўскую прывілею насіць імя “Дон Кіхота ў лепшым сэнсе гэтага слова” [1, 144], варты, на думку В. Куляшовай, бессмяротнасці.

Напрыканцы літаратуразнаўчае эсэ В. Куляшовай “Лясному рэху праўду раскажу…” набывае рысы глыбокага філасафізму: “Несмяротнасць – гэта не “бронзы многопудье”, якое адвяргаў і мой бацька, а магчымасць удзельнічаць у справах жывых вопытам свайго жыцця, замацаваным у мастацкім слове” [1, 334].

Такім чынам, кніга В. Куляшовай садзейнічае больш глыбокаму разуменню чалавечага, творчага і грамадзянскага аблічча Паэта, імя якога ў будзённым жыцці – Аркадзь Куляшоў.

Літаратура

1. Куляшова, В. Лясному рэху праўду раскажу…: літаратуразнаўчае эсэ / В. Куляшова. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 335 с.

2. Дубіна, Г. Эсэ як донар жанрава-стылёвых рысаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http: elib.bsu.by / bitstream.

3. Цімошык, Л. Ад радаводу да таямніц вершаскладання / Л. Цімошык // Звязда. – 2014. – 1 сакавіка. – С. 3.

МГПУ им. И.П.Шамякина